


**Сёння ў нумары «звяздоўскі» насценны каляндар**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 СТУДЗЕНЯ 2018 г. СЕРАДА №1 (28617)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# РАЗАМ МЫ ЗМОЖАМ МНОГАЕ

## Навагодні зварот Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі да беларускага народа



Фота БЕЛТА.

Дарагія сябры!

Непрыкметна, але ўпэўнена і немінуча надыходзіць Новы, 2018 год. У гэтыя хвіліны асабліва адчувальна, які імклівы час.

Так, галоўная адметнасць нашага часу — яго імклівы бег. Ісці крокам сёння раўназначна спыненню, стаяць — гэта адступаць назад. Мы пастаянна некуды спяшаемся, многае абавязаны паспець, каб наперадзе замаячыў той самы, жаданы вынік.

Зрэшты, і ў бурным патоку гэтага жыцця прытармазіць часам усё ж неабходна — хоць на імгненне — каб убачыць, ацаніць, падумаць аб важным і сказаць добрыя словы.

Перадначагодняя хвіліны — менавіта такое імгненне. Цяпер, калі да бою гадзінніка застаецца зусім няшмат часу, успамінаем галоўнае, думаем пра будучыню.

У адыходзячым годзе намі прыняты рашучыя меры па ўдасканаленні эканомікі, што немінуча прывядзе да змянення нашага грамадства. Мы рызыкнулі зазірнуць за гарызонт, паставілі перад краінай мэты заўтрашняга дня. Дасягнуць іх — справа многіх гадоў!

У сувязі з гэтым мой зварот да моладзі: дзейнічайце, ствараеце! Для вас адкрыты ўсе дзверы! Вы абавязаны ўзяць гэту неймаверна цяжкую вышыню. За вамі будучае краіны!

А вам, старэйшаму пакаленню, думаць пра спакой не атрымаецца. Вы нам патрэбны асабліва цяпер. Патрэбны вашы вопыт, веды, мудрасць. Менавіта вы павінны дапамагчы маладым у працэсе складанага руху наперад, уберагчы іх ад неабгрунтаванага імкнення зрабіць усё за імгненне, небяспекі адарвацца ад рэальнага жыцця і змарнаваць час.

Цяпер дарагі кожны дзень для стваральнай працы. Наперадзе ў нас шмат важных спраў ва ўсіх сферах жыцця краіны.

І будучы год — пярэдадзень вялікіх спартыўных падзей міжнароднага маштабу. Да нас прыедуць тысячы гасцей. І як сапраўдныя гаспадары беларускай зямлі мы аб'яднаемся і прывядзём наш агульны дом у належны парадак.

СТАР. 2

# Святочная «эстафета»



Кіроўца сталічнага ААТ «Мапід» Юрый ШУХНО са сваімі сынамі Мацвеем і Мікітам у першы вечар новага 2018 года прыйшоў святкаваць на Кастрычніцкую плошчу Мінска. Фотарэпартаж аб тым, як святкавалі мінчане і госці горада Новы год, глядзіце на сайце zviazda.by

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X
18001
9 771990 763008